

Выступае настаўніца пачатковых класаў мінскай гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны Наталля Трухан.

**Сярод мноства асацыяцый, што выклікае ў нас Дзень ведаў, — першага верасня, першая настаўніца, першы ўрок, першы школьны званок і інш. — далёка не апошняе месца займае і гэтая — першая кніга, першы школьны падручнік... Бо менавіта ў школе ў чалавека пачынае фарміравацца ўяўленне пра кнігу як пра асаблівы прадмет навакольнай рэчаіснасці, а менавіта як пра незаменную крыніцу ведаў, адзіную рэальную машыну часу, якая здольна ўмомант перанесці чалавека ў іншыя эпохі і краіны, адмысловы компас у заблытанай сучаснасці, урэшце, як пра надзейнага сябра і дарадцу ў жыцці.**

# Дзецям малым — пачатак усякай добрай навукі

ных выданняў пераважна для дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту: казкі, у тым ліку народныя і аўтарскія, паэтычныя зборнікі Міхася Пазнякова, Раісы Баравіковай, Уладзіміра Мазго, Уладзіміра Мацвеенкі і інш., кнігі з папулярнай серыі "Скарбы роднай прыроды", дзіцячыя энцыклапедыі, зборнікі міфаў і паданняў. Самае ж пачэснае месца ў экспазіцыі выставы "Сучасная дзіцячая кніга" адведзена шэрагу выдатных кніг — пераможцаў штогадовага Нацыянальнага конкур-

для сердца и разума" — першы дзіцячы часопіс, што выдаваўся ў Маскве М.І.Новікавым ва універсітэцкай друкарні ў якасці дадатку да "Московских ведомостей". Шырока прадстаўлены і беларускія дзіцячыя кнігі першай паловы XX стагоддзя — "Беларускі лемантар, або Першая навука чытання" 1906 года Цёткі, "Другое чытанне для дзяцей-беларусаў" 1909 года Якуба Коласа, кнігі Янкі Купалы, Ілы Гурскага і інш.

А ў галерэі "Атрыум" культурна-асветніцкая дзея "Ча-



Ля стэнда сучаснай дзіцячай кнігі.

су "Мастацтва кнігі": букварам А.Клышкі і Н.Сторажавай, "Каз-

роўны свет дзіцячай кнігі" атрымала свой нечаканы і ча-

Каб яшчэ раз нагадаць пра ўсе гэтыя ісціны, напярэдадні сёлетняга Дня ведаў Нацыянальная бібліятэка Беларусі зладзіла сваю чарговую, ужо традыцыйную культурна-асветніцкую акцыю "Чароўны свет дзіцячай кнігі". І няма нічога дзіўнага ў тым, што на гэтае свята былі запрошаны менавіта дарослыя — настаўнікі, пісьменнікі, мастакі, выдаўцы, карацей кажучы, тыя, ад каго ў першую чаргу залежыць, якім чынам і наколькі эфектыўна адкрываецца для нашых дзетак чароўны свет кнігі. Балазе, настаўнікі добра разумеюць, што кніга нават і ў наш камп'ютэрны век — гэта ўсё.



Валерый Славук. Ілюстрацыя да казкі "Іван".



"Буквар" Карыёна Істоміна 1694 года.



Падручнікі XVII стагоддзя: "Азбука" Васілія Бурцова і "Граматыка" Мялеція Смятрыцкага (Масква).

Асабліва запомніліся словы настаўніцы пачатковых класаў мінскай гімназіі № 1 імя Францыска Скарыны Наталлі Сяргееўны Трухан, якая пачала сваё выступленне з цытаты самога нашага першадрукара: "Дзецям малым — пачатак усякай добрай навукі, а дарослым — памнажэнне ў навуцы". Гэтак Францыск Скарына пісаў пра сваю першую, выдадзеную амаль паўтысячагоддзя назад кнігу "Псалтыр" (Прага, 1517): "Псалом ест щит против бесовскым нощъным мечтанием и страхом, покой денным суетам и роботам, защититель младих и радость, старым потеха и песня, женам набожьная молитва и покраса, детем малым початок всякое доброе науки, дорослым помножение в науце, мужем моцное утверьжение". У той жа час Наталля Трухан нагадала прысутным і народную прымаўку "Не на карысць кнігі чытаць, калі вяршкі з іх хапаць", заўважыўшы, што асабліва важна сёння прывучыць дзяцей да ўдумлівага, уважлівага чытання. "Трэба, каб маленькі чытач, перагортваючы старонку за старонкай, з задавальненнем і цікавасцю адкрываў для сябе свет кнігі, душой і сэрцам дакрануўся да крынічнай чысціні і багацця роднай культуры", — слушна зазначыла настаўніца.

У рамках дзеі "Чароўны свет дзіцячай кнігі" ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адкрыліся дзве кніжныя выставы — "Сучасная дзіцячая кніга" і "Дзіцячая кніга XVII—XX стагоддзяў" (яны будуць працаваць на працягу ўсяго верасня).

Першая ўключае каля ста найноўшых багата ілюстрава-

цы пра Івана-ганчара і пачвару-цара" А.Грачанікава, "Дзікаму паляванню караля Стаха" У.Караткевіча.

Экспазіцыю другой выставы склалі разнастайныя кнігі для дзяцей і падручнікі, выдадзеныя ў Беларусі і Расіі ў XVII—XX стагоддзях. Сярод каштоўных рарытэтаў тут можна ўбачыць знакамітую "Граматыку" Мялеція Смятрыцкага 1648 года, "Буквар" Карыёна Істоміна 1694 года (адзін з лепшых ілюстраваных буквароў XVII стагоддзя), "Буквар" Фёдара Палікарпава 1701 года і інш. Асаблівую ўвагу наведвальнікаў прыцягне арыгінальнае выданне XVIII стагоддзя — "Детское чтение

каны працяг: тут разгарнулася ўласна мастацкая выстава, дзе можна ўбачыць каля 20 малюнкаў маладой пісьменніцы і мастачкі Ясеніі Сцяпанавай і 22 шыкоўныя графічныя ілюстрацыі да яе кнігі "Купалінка", выкананыя вядомым беларускім графікам, лаўрэатам Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь, лепшым ілюстратарам 2009 года па выніках конкурсу "Мастацтва кнігі" Валерыем Славуком. Магчыма, толькі тут напоўніцу і разумееш, чаму свет дзіцячай кнігі з'яўляецца чароўным. Чары гэтыя — на ўсё жыццё.



Валерый Славук. Ілюстрацыя да казкі "Берагіня".

**Мікола ЧЭМЕР.**
**Фота Алега ІГНАТОВІЧА.**

## Прагноз надвор'я

Сёння днём па рэспубліцы чакаецца невялікая воблачнасць. Без ападкаў. Вецер няўстойлівы 3—8 м/с. Тэмпература паветра +19 — +25°С.

У наступныя двое сутак па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць. Пераважна без ападкаў. Ноччу і раніцай месцамі туман. Вецер паўднёва-ўсходні, паўднёвы 3—8 м/с. Тэмпература паветра: 02.09 ноччу +6 — +12°С, днём +21 — +27°С; 03.09 ноччу +9 — +15°С, днём +23 — +28°С.

**Рэспубліканскі гідраметэацэнтр.**